2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т.: Галоўная рэдакцыя БелСЭ. – Мінск, 1977-1984.
3. Шлегель, Г. Общая микробиология / Г. Шлегель. – Москва: Издательство «Мир», 1972. – 477 с.
4. Эльберт, Б. Я. Микробы и вирусы / Б. Я. Эльберт. – Минск: Государственное издательство БССР, 1960. – 544 с.

УДК 008 (476.6)

# УВАСАБЛЕННЕ ІДЭАЛА МІНУЎШЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

**Банцэвіч П. К.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Гістарычная і сацыякультурная сітуацыя XIX ст. абумовіла цікавасць да праблемы ўдасканалення грамадства, пераасэнсавання грамадскіх ідэалаў у літаратурнай і культурна-асветніцкай дзейнасці ў асяроддзі «краёвай» шляхты і інтэлігенцыі. Вызначальнае месца ў беларускай культуры XIX ст. займае ідэал мінуўшчыны, які адыгрываў функцыю пэўнай сацыяльнай матывіроўкі, што накіроўвала грамадскую думку і актыўнасць у напрамку вырашэння актульных для таго часу праблем: яднанне шляхты і сялянства ў барацьбе супраць рускага царызму, захаванне культурнай адметнасці. Праз мастацкую творчасць рэпрэзентавалася адчуванне самастойнасці гістарычнага шляху і ўсёй даўняй духоўнай спадчыны беларусаў, вызначаўся вектар далейшага сацыякультурнага развіцця.

Напрыклад, творчай канцэпцыі Я. Баршчэўскага ўласціва ідэалізацыя маладосці, абумоўленая не толькі асабістымі інтымнымі перажываннямі, але і аксіялагемай Радзімы.

Спробы ідэалізацыі канкрэтнага гістарычнага перыяда прасочваюцца ў «Спевах пра даўніх ліцвінаў да 1434 года» Я. Чачота. У сваёй прадмове аўтар сцвярджае, што кожны народ «шукае ў попеле мінуўшчыны сваю славу, свае асаблівасці, даказвае, што і ён заслугоўвае пашаны з боку іншых» [3, с. 126].

Часта вяртаецца ў сваіх думках і мроях і вяртае сваіх герояў у свет мінулага, на Радзіму дзеля яе захавання А. Міцкевіч. У вяртанні дзяржаўнасці паэту бачылася адраджэнне народа, яго былой славы і моцы: «*Успамінаюць. Хто з вас не заплакаў / Ад радасці – бач, помняць нашу славу?! / А вернем славу – вернем і дзяржаву, / Бо з парастка пачатак дрэва волі*» [2, с. 26]. Вяртаецца ў дом свайго дзяцінства пасля

вучобы Тадэвуш, вяртаецца да даўнейшых звычаяў Падкаморы, вяртаецца на Радзіму, каб адпомсціць за яе ганьбаванне Конрад Валенрод. Ідэал мінуўшчыны ў творчай спадчыне А. Міцкевіча набывае выразную функцыю абуджэння народа з выразнай мэтай вяртання страчанага: дзяржавы, волі, самастойнасці.

В. Дунін-Марцінкевіч. называе свой час «мізэрным і дробным», а мінулае рэпрэзентуе тыпалагічна блізкім «залатой эпосе»: «*Эх, міла ўспомніць нам мінулае стагоддзе, / Калі гасціннасць працвітала ў народзе, / Калі быў госцю рады бедны і багаты / Суседзі з панам дому грамадой суладнай / Цяпер звычай другі ўжо – цывілізаваны, / Заместа сэрцаў сёння ліст пафарбаваны*» [1, с. 185]. Постаці крывіцкіх князёў Грамабоя («Стаўроўскія дзяды») і Барыса («Травіца брат-сястрыца»), узятыя з народных паданняў, перадавалі адчуванне самастойнасці старажытнай духоўнай спадчыны беларусаў.

У беларускім жывапісе таго часу рамантычная інтэрпрэтацыя ідэала мінулага знайшла сваё адлюстраванне ў творчасці Ф. Смуглевіча «Прысяга Т. Касцюшкі на Кракаўскім рынку», Я. Сухадольскага «Бітва пад Грунвальдам», М. Андрыёлі «Бітва ліцвінаў з крыжакамі», К. Альхімовіча «Пахаванне Гедыміна», «Адпачынак Кейстута». Звяртаючыся да драматычна-гераічных момантаў гісторыі, мастакі актывізавалі нацыянальную свядомасць, выконвалі патрыятычна-павучальную і матывуючую ролю.

Ідэалізацыя мінулага праз адлюстраванне помнікаў колішняй велічы выразна назіраецца ў творчасці Н. Орды, В. Дмахоўскага «Руіны замкаў у Медніках», «Руіны Тракайскага замка», Ю. Пешкі «Лідскі замак». Пейзажы з відамі разбураных гістарычных каштоўнасцей вызначаюцца сваёй мемарыяльнай накіраванасцю, выхаваннем культуры памяці і бясспрэчнага сцверджання наяўнасці трывалага гістарычнага грунту беларускай нацыі.

Такім чынам, мастацка-вобразная ідэалізацыя мінулага, прадстаўленая ў розных варыянтах (бесклапотны час дзяцінства і час змагарнай маладосці, эпоха патрыярхальнага ладу, зварот да гісторыі ВКЛ як да «залатога стагоддзя»), мела на мэце своеасаблівае маральнае супрацьстаянне абставінам, ворагу праз суаднясенне апісваемых падзей з сучаснасцю, а таксама пошук і захаванне ўласнай ідэнтычнасці ва ўмовах адсутнасці дзяржаўнасці.

Ідэал мінуўшчыны выступае своеасаблівым жыццёвым арыенцірам, дасканалым узорам існавання, паколькі, нягледзячы на сваю сканструяванасць з былых дасягненняў, валодае пэўнай перспектывай, падказвае, на што чалавеку і грамадству арыентавацца ў

сучасным з мэтай вызначыцца і трывала замацавацца ў якасці самастойнага суб'екта культуры.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Дунін-Марцінкевіч, В. Выбраныя творы / В. Дунін-Марцінкевіч. – Мн. : Маст. літ., 2001. – 239 с.
2. Міцкевіч, А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве: шляхецкая гісторыя 1811–1812 гг.:у 12 кн. / А. Міцкевіч. – Мн. : Маст. літ., 1998. – 367 с.
3. Чачот, Я. Свіцязь: выбраныя творы / Я. Чачот. – Мн.: БелЭн, 1999. – 220 с.

УДК 130.2

# ФОРМИРОВАНИЕ ИДЕНТИЧНОСТИ В СОВРЕМЕННОМ ОБЩЕСТВЕ

**Бусько И. В.**

УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Одной из сложнейших проблем в современном обществе является формирование идентичности. Понятие идентичности в широкий междисциплинарный оборот было введено психологом Э. Эриксоном, который связывал его с процессами развития личности, неизбежно проходящим через периодические кризисы. Под идентичностью понимают категорию социально-гуманитарных наук, применяемую для описания индивидов и групп в качестве относительно устойчивых, «тождественных самим себе» целостностей [1]. Понятие идентичности в современном знании имеет три основные модальности: личностная идентичность (самоидентичность) подразумевает чувство тождества, целостности своего «Я», т.е. единства и преемственности личностной жизнедеятельности, смысложизненных и ценностных ориентаций отдельного человека, социальная (социокультурная) идентичность означает отнесение человеком себя и осознание своей принадлежности к различным социальным группам и общностям, а психофизиологическая идентичность выражается в единстве и преемственности психических и физиологических процессов организма.

В современном обществе действуют факторы, которые трансформируют протекание кризисов личностной идентичности, формируя предпосылки кризисов социальной идентичности. Один из таких факторов – глобализация информационного пространства, способствующая распространению шаблонов массовой вестернизированной культуры. Эта культура вступает в противоречие с целым рядом социокультурных идентичностей, включающих в том числе этническую, национальную